неўскага, «Два полі», «Ехаў Ясь на кані» і інш.). Калектыў — лаўрэат і дыпламант абл. тура ўсебел. фестывалю нар. мастацтваў «Беларусь — мая песня» (г. Віцебск, 1990), удзельнік заключнага агляду-конкурсу сельскай маст. самадзейнасці (Мінск, 1980).

*І.В.Бурава.*

**ВЫПАДКО́ВАЯ РЫ́ФМА**, рыфма, якая ўзнікае пры сугучнасці выпадковых або недакладна ўжытых слоў. Яе з'яўленне ў творы абумоўлена не патрэбамі паэт. сэнсу, а жаданнем аўтара захаваць сугучча заключных радкоў вершаванага радка. Гэта «рыфма дзеля рыфмы». Часам гэта вядзе да няправільнага карыстання словам, ужывання яго не ў тым значэнні і не ў той форме, якую вымагае паэт. кантэкст:

Летняя ночка *купальная* (замест купальская)
Яснай растаяла знічкаю.
Падаюць зоры світальныя
У чыстыя воды крынічныя.

(М.Шушкевіч. «Ты мне вясною прыснілася»)

**ВЫПРАЎЛЕ́ННЕ**, вясельны абрад *благаславення* і праваду маладых да вянца. Вылучыць тыповы абрад блаславення для ўсяго бел. вяселля складана, бо ў кожнай мясцовасці ён мае лакальную спецыфіку. У язычніцкую эпоху жаніх і нявеста, збіраючыся браць шлюб, першапачаткова пакланяліся покуці: «Ой, куце, мой куце, блаславі мяне». Хрысціянства прымеркавала гэты абрад да сваіх патрэб, парушыўшы паслядоўнасць асобных элементаў. Абрад В. пачынаўся з блаславення маладой яе бацькамі, раднёй і блізкімі. Перад ад'ездам маладых да вянца іх тройчы абводзілі вакол стала, а яны ў сваю чаргу кланяліся ўсім, прасілі добрай долі («Кланяйся, Марыся, кланяйся, // Кланяйся старому й малому. // Старому й малому — да ручак, // Сваёй матаньцы — да ножак»). Затым маці або бацька маладой у вывернутым кажусе, з прыполам аўса, міскай вады, запаленай грамнічнай свечкай, некалькімі розгамі абыходзілі вясельны поезд, кропячы ўсіх вадой і пасыпаючы аўсом («Крапі, тата, коні, прасі ў бога долі, каб была шчаслівa на многія гады»). В. было прасякнута абрадавымі дзеяннямі прадуцыруючага і ахоўнага характару, анімістычнымі і магічнымі матывамі: праезд вясельнага поезда праз агонь у варотах, абсыпанне зернем, хлеб з соллю, вывернуты кажух, аўчынная шапка з чырвоным бантам на галаве маладога, шум бразготак на конскай вупражы, чырвоныя ніткі, шпількі, іголкі ў маладой і інш. Продкі верылі, што гэтыя рытуальныя дзеі, прадметы, рэчы і аксесуары павінны былі забяспечыць шчаслівы шлюб маладых, засцерагчы іх ад уздзеяння злых сіл. Вясельным коням, іх вупражы са стужкамі, кветкамі, ручнікамі на дугах, званочкамі-шархунамі на шыях, нарэшце «пляснівай» масці надавалася таксама сімвалічнае значэнне ў пажаданні шчаслівай дарогі маладым да шлюбу. Перад выездам правяралі вупраж. Дрэнным лічылася для маладых, калі конь спатыкнецца, парвецца ў дарозе збруя, перакуліцца воз.

*А.М.Аляхновіч.*

**ВЫ́РВІЧ** Караль (2.11.1717, Браслаўскі павет — 6.6.1793), гісторык, географ, педагог. З шляхецкай сям'і. Вучыўся ў Віленскай акадэміі (1737—40, 1742—46). З 1734 у ордэне езуітаў, з 1745 ксёндз. Выкладаў у Пінскім, Крожскім і Навагрудскім езуіцкіх калегіумах. У 1751—57 прыватны настаўнік Гільзенаў у Дынабургу і Полацку, наведаў з імі Францыю, Галандыю і Германію. З 1757 выкладаў у Калегіум нобіліум у Варшаве, у 1762—76 яго рэктар. У 1760—61 куратар Мазавецкай правінцыі ордэна езуітаў. Зрабіў значны ўклад у рэфармаванне школьнай сістэмы езуітаў. З уступленнем на трон Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1764) у бліжэйшым акружэнні караля. Пасля скасавання ордэна езуітаў (1773) у 1775—91 абат гебдоўскі. Аўтар абагульняючых геагр. прац «Сучасная геаграфія» (т. 1, Варшава, 1768, забаронена да продажу паводле патрабавання рас. пасла М.В.Рапніна; 2-е выд. Вільня, 1794) і «Усеагульная геаграфія» (Варшава, 1770, 3-е выд. 1794), падручніка «Кароткае сістэматычнае выкладанне ўсеагульнай гісторыі» (т. 1—2, Варшава, 1766—71). У выдадзенай па ініцыятыве караля кн. «Палітычная гісторыя старажытных дзяржаў» (т. 1, Варшава, 1771) змясціў свой пераклад вытрымак з кн. «Пра дух законаў» Ш.Л.Мантэск'ё. Як гісторык В. зазнаў уплыў франц. асветнай гістарыяграфіі, асабліва Ш.Л.Мантэск'ё і Вальтэра. Адмоўна ставіўся да традыц. разумення гісторыі як гісторыі паліт. падзей і войн; гісторыю народа тлумачыў як сукупнасць змен у паліт. жыцці, звычаях, рэлігіі, навуцы, мастацтве, эканоміцы; падкрэсліваў, што вывучэнне гісторыі дазваляе атрымаць веды, неабходныя для накіраванай змены ў дзяржаве існуючага ладу.

*В.С.Пазднякоў.*

**ВЫ́САЦКАЯ МІКАЛА́ЕЎСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры класіцызму ў в. Высацк Слонімскага р-на. Пабу-



*Высацкая Мікалаеўская царква.*